Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»
______________ А. В. Макоўчык
«___» ______________2023 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-2-60/п.

# ПРАГРАМА
# ВЫТВОРЧАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

для спецыяльнасцей:
1–02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1–02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская);
1–02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская)

2023 г.

2

**СКЛАДАЛЬНІК:**

У. П. Саўко, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 23 11 2023 г.)
Загадчык кафедры Д. В. Дзятко

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 22 11 2023 г.)
Загадчык кафедры І. М. Мішчанчук

Кафедрай псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 от 21 11 2023 г.)
Загадчык кафедры С. А. Мясніковіч

Кафедрай педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 1 от 29 08 2023 г.)
Загадчык кафедры С. М. Сірэнка

Саветам філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 29 11 2023 г.)

**УЗГОДНЕНА:**

Дэкан філалагічнага факультэта В. Д. Старычонак
23 11 2023 г.

Дырэктар ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Мінска імя В. П. Чкалава» У. А. Сняжкоў
23 11 2023 г.

Афармленне праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Кіраўнік практыкі ВМА ЦАМЗАД А. А. Лешык

Дырэктар бібліятэкі Н. П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў важнае месца займае педагагічная практыка. Яна з’яўляецца састаўной часткай адукацыйнага працэсу, забяспечвае спалучэнне тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў з іх практычнай дзейнасцю ў розных установах агульнай сярэдняй адукацыі: школах, гімназіях, ліцэях.

Праграма вытворчай педагагічнай практыкі студэнтаў трэцяга курса вочнай (дзённай) формы атрымання адукацыі філалагічнага факультэта БДПУ, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская)», распрацавана на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021 і АСВА 1-02 03 03-2021, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 20.04.2022 № 85; вучэбных планаў БДПУ для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура ад 15.07.2021 № 048–2021/у; 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура ад 23.06.2022 № 133–2022/у; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) ад 15.07.202 № 050–2021/у; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) ад 15.07.2021 № 051–2021/у; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) ад 23.06.2022 № 134–2022/у; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) ад 23.06.2022 № 135–2022/у.

Вытворчая педагагічная практыка на 3 курсе з’яўляецца лагічным працягам педагагічнай практыкі студэнтаў малодшых курсаў. Яна праводзіцца ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных умоў будучай прафесійнай дзейнасці. Яе **мэта** – падрыхтоўка студэнтаў да цэласнага выканання функцый настаўніка-славесніка, да правядзення сістэмы вучэбна-выхаваўчай працы з вучнямі.

Асноўнымі **задачамі** вытворчай педагагічнай практыкі з’яўляюцца:

– сацыяльная і псіхалагічная адаптацыя студэнтаў у педагагічным калектыве ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

– замацаванне і паглыбленне псіхолага-педагагічных і спецыяльных ведаў у працэсе іх выкарыстання пры вырашэнні канкрэтных педагагічных задач;

– фарміраванне прафесійна-метадычных уменняў і навыкаў, неабходных для паспяховага правядзення вучэбна-выхаваўчай працы ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі;

– развіццё педагагічнага мыслення, выпрацоўка творчага падыходу да педагагічнай дзейнасці;

– азнаямленне з сучасным станам вучэбна-выхаваўчай працы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, вывучэнне, аналіз і абагульненне перадавога педагагічнага вопыту;

– фарміраванне і развіццё прафесійных якасцей, неабходных настаўніку беларускай мовы і літаратуры.

Асаблівасцю вытворчай педагагічнай практыкі на трэцім курсе з’яўляецца тое, что студэнты знаёмяцца з рэальным зместам і аб’ёмам працы настаўніка. У адрозненне ад папярэдніх відаў практык, калі студэнты абмяжоўваліся адным-двума відамі працы, у час вытворчай педагагічнай практыкі кожны студэнт выконвае ўсе асноўныя абавязкі настаўніка-філолага.

Вытворчая педагагічная практыка студэнтаў трэцяга курса філалагічнага факультэта праводзіцца пасля вывучэння імі цыкла філалагічных дысцыплін, методык выкладання мовы і літаратуры, базавых курсаў педагогікі і псіхалогіі. У працэсе педагагічнай практыкі канкрэтызуюцца, замацоўваюцца і паглыбляюцца веды, набытыя студэнтамі падчас навучання ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

У **змест** вытворчай педагагічнай практыкі на трэцім курсе ўваходзіць:

– азнаямленне з установай агульнай сярэдняй адукацыі, з педагагічным калектывам, з арганізацыяй працэсу навучання і выхавання ў канкрэтнай установе адукацыі;

– агульнае азнаямленне з класам, у якім будзе праходзіць педагагічная практыка;

– азнаямленне з дакументацыяй установы агульнай сярэдняй адукацыі;

– наведванне ўрокаў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, замежнай мовы, што працуюць у дадзенай установе агульнай сярэдняй адукацыі;

– састаўленне індывідуальнага плана вучэбна-выхаваўчай працы на ўвесь перыяд практыкі;

– падрыхтоўка і правядзенне ўрокаў розных тыпаў;

– выкананне дыферэнцыраванага задання;

– выкананне заданняў па педагогіцы: аналіз выхаваўчага мерапрыемства, праведзенага класным кіраўніком; праектаванне, правядзенне, рэфлексія выхаваўчага мерапрыемства; аналіз рэалізацыі выхаваўчага і развіццёвага патэнцыялу ўрока;

– выкананне заданняў па псіхалогіі: вывучэнне асаблівасцей асобы вучня; аналіз паводзін вучня ў канкрэтнай сітуацыі (аналіз асобнага ўчынку); складанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі асобы вучня; псіхалагічны аналіз развіцця пазнавальных працэсаў вучняў на ўроку.

Праходжанне вытворчай педагагічнай практыкі павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных **кампетэнцый**:

– УК–6. Ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўмовах абнаўлення яе мэт, зместу, змены тэхналогій, вызначаць метады вырашэння прафесійных задач, ацэньваць іх эфектыўнасць і якасць;

– БПК–1. Праектаваць працэс навучання, ставіць навучальныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці;

– БПК–2. Праектаваць працэс выхавання, адбіраць метады, формы, тэхналогіі, якія адпавядаюць выхаваўчым мэтам і задачам, з улікам накіраванасці асобы навучэнцаў і прыярытэтаў выхаваўчай работы;

– БПК–5. Ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У выніку праходжання педагагічнай практыкі студэнты павінны:

1) **ведаць**:

– формы і метады навучання і выхавання, умовы іх аптымальнага выбару і спалучэння ў навучальным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

– метады, сродкі і арганізацыйныя формы навучання беларускай мове і беларускай літаратуры, змест і структуру школьнага курса беларускай мовы і беларускай літаратуры;

– узроставыя і індывідуальныя асаблівасці асобы вучняў падлеткавага і юнацкага ўзросту, заканамернасці развіцця пазнавальнай сферы асобы, алгарытм псіхалагічнага аналізу асобы вучня;

2) **умець**:

– арганізоўваць працэсы навучання і выхавання вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей;

– аналізаваць урокі беларускай мовы і беларускай літаратуры, эфектыўнасць выкарыстаных метадаў і прыёмаў навучання мове і літаратуры;

– планаваць і праводзіць розныя тыпы ўрокаў беларускай мовы і беларускай літаратуры, эфектыўна выкарыстоўваць розныя метады і сродкі навучання;

– складаць псіхолага-педагагічную характарыстыку асобы вучня, аналізаваць паводзіны вучня ў канкрэтнай сітуацыі, праводзіць псіхалагічны аналіз развіцця пазнавальных працэсаў вучняў на ўроку;

3) **валодаць**:

– сучаснымі тэхналогіямі арганізацыі самастойнай работы, даследчай дзейнасці, фарміравання прадметных, метапрадметных і асобасных кампетэнцый вучняў;

– уменнем вызначаць і вырашаць мэты і задачы ўрокаў беларускай мовы і беларускай літаратуры, правільна адбіраць вучэбны матэрыял, абгрунтавана выкарыстоўваць розныя тыпы ўрокаў, формы, метады і прыёмы навучання, сучасныя сродкі навучання;

– прыёмамі вывучэння асобы вучня, спосабамі рэфлексіі асабістай педагагічнай дзейнасці падчас практыкі.

Вытворчую педагагічную практыку студэнты трэцяга курса вочнай (дзённай) формы атрымання адукацыі праходзяць у 5–9 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі **на працягу** 6 (шасці) тыдняў, у тым ліку па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» – 6 (шэсць тыдняў); па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская/ кітайская)» – 6 (шэсць) тыдняў, у тым ліку 4 (чатыры) тыдні па беларускай мове і літаратуры, 2 (два) тыдні па замежнай мове.

Працаёмкасць практыкі 324 акадэмічныя гадзіны, 9 заліковых адзінак.

Асноўнымі **крытэрыямі ацэнкі вынікаў вытворчай педагагічнай практыкі** з’яўляюцца:

– ступень сфарміраванасці у студэнтаў прафесійна-педагагічных уменняў выкарыстання на практыцы спецыяльных і псіхолага-педагагічных ведаў;

– узровень прафесійнай накіраванасці асобы будучага настаўніка: інтарэс да педагагічнай дзейнасці, здольнасці да самарэгуляцыі, самаадукацыі, імкненне да прафесійнага самаўдасканалення; наяўнасць такіх прафесійных якасцей, як любоў да дзяцей, самастойнасць, ініцыятыўнасць, адказныя і творчыя адносіны да працы і інш.

Пры гэтым ацэньваюцца:

– сістэма прафесійна-педагагічных ведаў (веды па лінгвістыцы і літаратуразнаўстве, веды па методыцы выкладання мовы і літаратуры; веды па педагогіцы і псіхалогіі);

– сістэма прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў (валоданне методыкай выкладання вучэбных дысцыплін, прымяненне прафесійна-педагагічных ведаў на практыцы);

– асобасныя прафесійна значныя якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры (шырокая эрудыцыя, культура вуснага і пісьмовага маўлення, разуменне ролі мовы і літаратуры для фарміравання духоўнага свету чалавека і інш.).

Для ацэнкі вынікаў вытворчай педагагічнай практыкі выкарыстоўваюцца наступныя **метады**:

– назіранне за студэнтамі ў час правядзення імі ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў;

– аналіз і ацэнка якасці вучэбна-выхаваўчай працы, якую праводзяць практыканты;

– гутаркі з настаўнікамі, класнымі кіраўнікамі, студэнтамі;

– аналіз і ацэнка дакументацыі студэнтаў: дзённікаў, канспектаў урокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў, справаздач аб рабоце і інш.;

– самаацэнка студэнтамі якасці сваёй вучэбна-выхаваўчай працы ва ўстанове адукацыі.

З мэтай ацэнкі вынікаў вытворчай педагагічнай практыкі праводзіцца **дыферэнцыраваны залік.**

# ЗМЕСТ ВЫТВОРЧАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Вытворчая педагагічная практыка на трэцім курсе арганізуецца з улікам дыферэнцыраванага падыходу. Падставай для дыферэнцыраванага падыходу з’яўляецца ў першую чаргу наяўнасць у студэнтаў вопыту педагагічнай дзейнасці па спецыяльнасці, якая адпавядае профілю факультэта. Калі студэнты працуюць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры, англійскай (кітайскай) мовы, яны праходзяць педагагічную практыку па месцы работы. Але за імі таксама замацоўваюцца кіраўнікі практыкі ад кафедр і ад установы агульнай сярэдняй адукацыі (вопытны настаўнік).

Вытворчая педагагічная практыка складаецца з некалькіх этапаў.

На *першым этапе* (першы тыдзень практыкі) адбываецца агульнае азнаямленне студэнтаў з установай агульнай сярэдняй адукацыі, класам, арганізацыяй вучэбна-выхаваўчай працы, з патрабаваннямі да вядзення дзенніка практыкі, вывучэнне зместу заданняў па педагогіцы і псіхалогіі.

Практыкант наведвае ўрокі настаўнікаў у замацаваным класе, а таксама ўрокі настаўнікаў па сваёй спецыяльнасці ў другіх класах, удзельнічае ў іх аналізе, знаёміцца з рознымі відамі пазакласнай працы, вывучае школьную дакументацыю. Вынікі назіранняў за вучэбным працэсам па беларускай (замежнай) мове і літаратуры афармляюцца ў выглядзе пратакольных запісаў урокаў.

Студэнты, якія праходзяць педагагічную практыку па месцы працы, працягваюць праводзіць урокі ў адпаведнасці са сваёй педагагічнай нагрузкай, а з мэтай вывучэння педагагічнага вопыту наведваюць і аналізуюць урокі настаўніка, які прызначаны непасрэдным кіраўніком практыкі ад установы агульнай сярэдняй адукацыі.

К канцу першага тыдня практыкант састаўляе індывідуальны план вучэбна-выхаваўчай працы на ўвесь перыяд практыкі. Графікі заліковых урокаў з указаннем тэмы ўрока, даты і часу яго правядзення, нумара кабінета, здаюцца кіраўнікам практык ад кафедр і кіраўніку практыкі ад факультэта.

На *другім, асноўным, этапе* вытворчай педагагічнай практыкі студэнт праводзіць самастойна ўсе ўрокі мовы і літаратуры ў замацаваным за ім класе.

Падрыхтоўка да самастойнага правядзення ўрокаў адбываецца ў наступнай паслядоўнасці. Спачатку студэнт кансультуецца па тэме ўрока з настаўнікам ці групавым кіраўніком, затым распрацоўвае разгорнуты план-канспект урока, які падае на зацвярджэнне настаўніку (ці групавому кіраўніку) за 1–2 дні да правядзення ўрока. Студэнт не дапускаецца да правядзення ўрока, калі ў яго адсутнічае канспект гэтага ўрока.

Пры правядзенні ўрокаў мэтазгодна выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйна-камп’ютарныя тэхналогіі і сродкі навучання (электронныя адукацыйныя рэсурсы па прадмеце, мультыборды, інтэрактыўныя дошкі і інш.).

За час практыкі студэнты, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура», павінны:

– наведаць 20 урокаў беларускай мовы і літаратуры, якія праводзяць настаўнікі ці студэнты-практыканты;

– правесці тры пробныя і тры заліковыя ўрокі па беларускай мове, два пробныя і два заліковыя ўрокі па беларускай літаратуры;

– наведваць заліковыя ўрокі, якія праводзяць студэнты-практыканты, і ўдельнічаць у іх аналізе;

– выканаць адно з дыферэнцыраваных заданняў (на выбар);

– выканаць заданні па педагогіцы і псіхалогіі;

– падрыхтаваць выніковую дакументацыю па практыцы.

Студэнты, якія праходзяць практыку па месцы работы ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры, за час практыкі:

– наведваюць не менш за 6 урокаў настаўніка беларускай мовы і літаратуры;

– праводзяць згодна са сваёй педагагічнай нагрузкай усе ўрокі, з якіх тры ўрокі па беларускай мове і два ўрокі па беларускай літаратуры з'яўляюцца заліковымі;

– выконваюць адно з дыферэнцыраваных заданняў (на выбар);

– выконваюць заданні па педагогіцы і псіхалогіі;

– рыхтуюць выніковую дакументацыю па практыцы.

Студэнты, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская / кітайская)», пры праходжанні педагагічнай практыкі па беларускай мове і літаратуры павінны:

– наведаць 14 урокаў беларускай мовы і літаратуры, якія праводзяць настаўнікі ці студэнты-практыканты;

– правесці два пробныя і два заліковыя ўрокі па беларускай мове, два пробныя і два заліковыя ўрокі па беларускай літаратуры;

– наведваць заліковыя ўрокі, якія праводзяць студэнты-практыканты, і ўдельнічаць у іх аналізе;

– выканаць адно з дыферэнцыраваных заданняў (на выбар);

– выканаць заданні па педагогіцы і псіхалогіі;

– падрыхтаваць выніковую дакументацыю па практыцы.

Пры праходжанні педагагічнай практыкі *па замежнай мове* студэнты трэцяга курса:

– наведваюць і аналізуюць 6 урокаў настаўнікаў замежнай мовы;

– падбіраюць метадычную літаратуру, наглядны і раздатачны матэрыял для ўрокаў замежнай мовы;

– праводзяць два пробныя і два заліковыя ўрокі і абмяркоўваюць іх у адпаведнасці са схемай аналізу ўрока (на адным з заліковых урокаў павінны быць выкарыстаны мультымедыйныя сродкі);

– рыхтуюць два пісьмовыя аналізы ўрокаў замежнай мовы (аднаго ўрока, праведзенага настаўнікам-прадметнікам, і аднаго ўрока, праведзенага іншым студэнтам-практыкантам);

– праводзяць пазакласнае мерапрыемства па замежнай мове;

– рыхтуюць выніковую дакументацыю па практыцы.

Усе ўрокі, праведзеныя студэнтамі, абмяркоўваюцца і аналізуюцца пры ўдзеле практыкантаў, настаўніка, групавога кіраўніка. Заліковыя ўрокі абмяркоўваюцца і ацэньваюцца.

У апошні тыдзень практыкі студэнт састаўляе пісьмовую справаздачу аб выкананні праграмы практыкі.

Па заканчэнні практыкі непасрэдны кіраўнік практыкі ад арганізацыі (настаўнік) афармляе пісьмовы водзыў аб праходжанні практыкі студэнтам.

Пасля завяршэння педагагічнай практыкі на працягу аднаго–двух тыдняў кожны студэнт здае дыферэцыраваны залік кіраўніку практыкі ад кафедры. Пры правядзенні заліку студэнт прад'яўляе дзеннік практыкі, выкананыя і ацэненыя заданні па педагогіцы і псіхалогіі, справаздачу аб выкананні праграмы практыкі, пісьмовы водзыў непасрэднага кіраўніка практыкі ад арганізацыі.

Студэнт, які не выканаў праграму практыкі, атрымаў адмоўны водзыў кіраўніка практыкі ад арганізацыі (настаўніка), нездавальняльную адзнаку пры здачы дыферэнцыраванага заліку, паўторна накіраўваецца на практыку ў вольны ад заняткаў час.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## 1. Справаздачная дакументацыя па педагагічнай практыцы

Справаздачная дакументацыя студэнтаў-практыкантаў **па беларускай мове і літаратуры** ўключае:

1) дзённік па педагагічнай практыцы (гл. дадатак 1) (прад’яўляецца на праверку кіраўніку практыкі ад кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі);

2) выкананае дыферэнцыраванае заданне (адно на выбар) (гл. дадатак 5);

3) выкананае заданне па псіхалогіі (гл. дадатак 8) (прад’яўляецца на праверку кіраўніку практыкі ад кафедры псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці);

4) выкананае заданне па педагогіцы (гл. дадатак 9) (прад’яўляецца на праверку кіраўніку практыкі ад кафедры педагогікі);

5) справаздачу аб выкананні праграмы педагагічнай практыкі, падпісаную студэнтам, непасрэдным кіраўніком практыкі ад арганізацыі (настаўнікам), зацверджаную кіраўніком арганізацыі (дырэктарам установы адукацыі ці яго намеснікам) і замацаваную гербавай пячаткай (гл. дадатак 6);

6) водзыў непасрэднага кіраўніка практыкі ад арганізацыі (настаўніка) аб праходжанні практыкі студэнтам (гл. дадатак 7).

Студэнты, якія праходзяць вытворчую педагагічную практыку **па замежнай мове**, павінны здаць на праверку кіраўніку практыкі ад кафедры замежных моў:

1) справаздачу аб практыцы, падпісаную студэнтам, непасрэдным кіраўніком практыкі ад арганізацыі, зацверджаную кіраўніком арганізацыі ці яго намеснікам і замацаваную гербавай пячаткай (гл. дадатак 5). Да справаздачы могуць быць дадаткі ў выглядзе фотагазеты, відэапрэзентацыі і інш.;

2) два канспекты заліковых урокаў;

3) нагляднасць, раздатачны матэрыял;

4) пісьмовы аналіз двух урокаў;

5) водзыў аб рабоце студэнта-практыканата, састаўлены настаўнікам замежнай мовы (гл. дадатак 7).

## 2. Прыкладны план справаздачы аб выкананні праграмы педагагічнай практыкі

1. Места праходжання педагагічнай практыкі, клас.

2. Колькасць наведаных урокаў па беларускай мове і літаратуры і іншых прадметах, мэтазгоднасць наведвання (якія станоўчы вопыт быў пераняты, якія недахопы ў правядзенні ўрокаў былі ўлічаны).

3. Тэмы заліковых урокаў; літаратура, якая была выкарыстана пры падрыхтоўцы канспектаў урокаў; якасць кансультацый настаўніка-прадметніка і кіраўніка практыкі ад кафедры.

4. Аналіз асабістай педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры (якія ўменні і навыкі былі набытыя за час педагагічнай практыкі, якіх уменняў і навыкаў не хапала, якія цяжкасці ўзнікалі пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрокаў і як яны пераадольваліся і інш.).

5. Звесткі пра выхаваўчае мерапрыемства, якое было праведзена ў час практыкі.

6. Выкананне індывідуальнага плана практыкі: што выканана, што – не, прычыны невыканання.

7. Прапановы па ўдасканаленні прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі ва ўстанове вышэйшай адукацыі і правядзенні вытворчай педагагічнай практыкі.

## 3. Кіраўніцтва вытворчай педагагічнай практыкай

**Факультэцкі кіраўнік педагагічнай практыкі**:

– устанаўлівае сувязь з установамі агульнай сярэдняй адукацыі, якія з'яўляюцца базавымі для праходжання студэнтамі педагагічнай практыкі;

– размяркоўвае студэнтаў па ўстановах адукацыі, базавых для праходжання педпрактыкі;

– рыхтуе загад па педагагічнай практыцы, забяспечвае арганізацыю практыкі;

– арганізуе і праводзіць курсавы сход па педагагічнай практыцы;

– ажыццяўляе кантроль за ходам педагагічнай практыкі;

– забяспечвае своечасовае афармленне агульнай экзаменацыйнай ведамасці па педагагічнай практыцы, дакументаў для аплаты працы настаўнікаў устаноў, у якіх праходзіла практыка;

– рыхтуе справаздачу аб выніках педагагічнай практыкі;

– уносіць прапановы па ўдасканаленні арганізацыі педагагічнай практыкі, удзельнічае ў абмеркаванні пытанняў арганізацыі практыкі на пасяджэннях кафедры, Навукова-метадычнага савета і Савета факультэта.

**Кіраўнікі практыкі ад кафедр мовазнаўства і лінгвадыдактыкі, беларускай і замежнай літаратуры, замежных моў**:

– рыхтуюць прапановы аб размеркаванні студэнтаў на практыку ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі;

– прымаюць ўдзел у курсавым сходзе па педагагічнай практыцы;

– сумесна з кіраўніцтвам установы агульнай сярэдняй адукацыі размяркоўваюць студэнтаў па класах;

– арганізуюць наведванне студэнтамі ўрокаў па прадмеце, іх аналіз;

– кансультуюць студэнтаў пры падрыхтоўцы да ўрокаў, правяраюць і зацвярджаюць канспекты ўрокаў;

– прысутнічаюць на ўроках, якія праводзяць студэнты, арганізуюць калектыўнае абмеркаванне ўрокаў, ацэньваюць іх;

– правяраюць справаздачную дакументацыю студэнтаў, выстаўляюць адзнакі за педагагічную практыку (з улікам меркаванняў настаўнікаў), прымаюць дыферэнцыраваны залік;

– падаюць факультэцкаму кіраўніку справаздачу пра ход і вынікі педагагічнай практыкі;

– своечасова афармляюць дакументы на аплату працы настаўнікаў ўстаноў, у якіх праходзіла педагагічная практыка.

**Кіраўнік практыкі ад кафедры педагогікі**:

– прымае ўдзел у курсавым сходзе па педагагічнай практыцы;

– арганізуе наведванне і аналіз практыкантамі выхаваўчых мерапрыемстваў;

– кансультуе практыкантаў пры выкананні імі заданняў па педагогіцы, правярае планы мерапрыемстваў, якія праводзяць студэнты;

– прысутнічае на пазакласных мерапрыемствах, арганізуе іх абмеркаванне, ацэньвае якасць іх правядзення;

– правярае і ацэньвае выкананыя заданні па педагогіцы, выстаўляе адзнаку ў ведамасць;

– удзельнічае ў выніковай ацэнцы працы практыкантаў.

**Кіраўнік практыкі ад кафедры псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці**:

– прымае ўдзел у курсавым сходзе па педагагічнай практыцы;

– кіруе працай студэнтаў па вывучэнні асобы вучня, калектыву вучняў, кансультуе практыкантаў па пытаннях выканання заданняў па псіхалогіі;

– кансультуе студэнтаў па псіхолага-педагагічным пытаннях, якія ўзнікаюць у час практыкі;

– правярае і ацэньвае выкананыя заданні па псіхалогіі, выстаўляе адзнаку ў ведамасць;

– удзельнічае ў выніковай ацэнцы працы практыкантаў.

**Дырэктар установы агульнай сярэдняй адукацыі (яго намеснік):**

– забяспечвае належныя ўмовы для правядзення педагагічнай практыкі, праводзіць адпаведную работу з педагагічным калектывам і вучнямі;

– знаёміць студэнтаў з арганізацыяй вучэбна-выхаваўчай працы ва ўстанове адукацыі, з неабходнай дакументацыяй, вучэбна-матэрыяльнай базай школы (ліцэя, гімназіі) і інш.;

– сумесна з групавым кіраўніком размяркоўвае студэнтаў па класах;

– зацверджвае пісьмовыя справаздачы студэнтаў аб праходжанні праграмы практыкі.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры**:

– знаёміць замацаваных за ім студэнтаў з каляндарна-тэматычным планам своёй працы, праводзіць адкрытыя ўрокі;

– кансультуе студэнтаў пры падрыхтоўцы да правядзення ўрокаў, правярае і зацвярджае планы-канспеты ўрокаў;

– аказвае дапамогу студэнтам пры падрыхтоўцы і правядзенні пазакласных мерапрыемстваў па прадмеце;

– наведвае і аналізуе ўсе ўрокі, якія праводзіць студэнт, удзельнічае ў іх ацэнцы;

– аказвае дапамогу студэнтам пры правядзенні індывідуальных кансультацый з вучнямі, пры праверцы сшыткаў і інш.

**Класны кіраўнік**:

– знаёміць студэнтаў з вучнямі класа, іх паспяховасцю, паводзінамі, з асноўнымі выхаваўчымі задачамі і планам выхаваўчай работы;

– аказвае дапамогу студэнтам у вывучэнні індывідуальных асаблівасцей школьнікаў;

– кансультуе студэнтаў пры падрыхтоўцы плана выхаваўчай работы, пры напісанні планаў і канспектаў выхаваўчых мерапрыемстваў;

– прыцягвае студэнтаў да бягучай выхаваўчай працы ў класе;

– прысутнічае на выхаваўчых мерапрыемствах, што праводзяць студэнты, удзельнічае ў абмеркаванні і ацэньванні мерапрыемстваў.

## 4. Правы і абавязкі студэнтаў-практыкантаў

1. Студэнт-практыкант мае права:

– вывучаць дакументацыю ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў аб'ёме, вызначаным праграмай практыкі;

– звяртацца да кіраўнікоў практыкі ад кафедр і ад факультэта, да настаўніка-прадметніка па арганізацыйна-метадычных і іншых пытаннях, якія ўзнікаюць падчас практыкі;

– уносіць прапановы па арганізацыі і правядзенні практыкі;

– карыстацца бібліятэкай, кабінетамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, спартыўным інвентаром і іншым абсталяваннем, неабходным для выканання праграмы практыкі.

2. Студэнт-практыкант абавязаны:

– удзельнічаць у курсавым сходзе па арганізацыйна-метадычных пытаннях педагагічнай практыкі;

– своечасова выконваць усе віды работ, якія прадугледжаныя праграмай практыкі;

– весці дзённік практыкі;

– выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі;

– выконваць распараджэнні адміністрацыі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і непасрэднага кіраўніка практыкі (настаўніка-прадметніка);

– своечасова аформіць і прадаставіць справаздачную дакументацыю па педагагічнай практыцы кіраўнікам ад кафедр.

3. На перыяд практыкі адзін са студэнтаў групы прызначаецца старастай. У яго абавязкі ўваходзіць улік наведвання студэнтаў, агульная арганізацыя працы, выкананне даручэнняў кіраўнікоў практыкі.

# 5. ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай мовы [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад. У. П. Саўко // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/6319. – Дата доступу: 16.11.2023.

2. Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі / В. У. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2023. – 167 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Беларуская мова [Электронны рэсурс] : вучэб. праграмы : V–XI кл. // Национальный образовательный портал. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-mova.html. – Дата доступу: 16.10.2023.

2. Беларуская літаратура [Электронны рэсурс] : вучэб. праграмы : V–XI кл. // Национальный образовательный портал. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу: 16.10.2023.

3. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс] // Национальный образовательный портал. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html.– Дата доступу: 16.10.2023.

4. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронный ресурс] // Национальный образовательный портал. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html.– Дата доступа: 16.10.2023.

5. Хуторской, А. В. Педагогическая инноватика : учеб. пособие для студентов вузов / А. В. Хуторской. – 3-е изд. – М. : Эйдос, 2019. – 215 с.

6. Чепиков, В. Т. Педагогическая практика : учеб.-практ. пособие / В. Т. Чепиков. – Минск : Новое знание, 2004. – 204 с.

*Дадатак 1*

# ПРЫКЛАДНАЯ ФОРМА ПЕДАГАГІЧНАГА ДЗЁННІКА СТУДЭНТА-ПРАКТЫКАНТА

I. У дзённіку павінна быць адлюстравана ўся праца, якую студэнт праводзіў ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі ў час педагагічнай практыкі.

У дзённіку змяшчаюцца:

– расклад урокаў у тым класе, за якім быў замацаваны студэнт-практыкант, расклад званкоў;

– спіс вучняў класа;

– індывідуальны план вучэбна-выхаваўчай працы на ўвесь перыяд практыкі;

– назіранні і аналіз урокаў, якія праводзілі настаўнікі і студэнты;

– назіранні і аналіз выхаваўчых мерапрыемстваў, праведзеных класнымі кіраўнікамі і студэнтамі;

– планы-канспекты ўсіх пробных і заліковых урокаў, якія правёў студэнт за час педагагічнай практыкі;

– справаздача аб ходзе і выніках педагагічнай практыкі.

II. Паслядоўнасць афармлення дзённіка можа быць наступнай:

1. Тытульны ліст:

Дзённік
па педагагічнай практыцы
студэнта 3 курса ___ групы
філалагічнага факультэта
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)

2.
Практыка праводзіцца ў ДУА «СШ № ___ горада _____________»
Кіраўнік практыкі ад кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
________________________________________________________
Кіраўнік практыкі ад кафедры беларускай і замежнай літаратуры
________________________________________________________
Кіраўнік практыкі ад кафедры педагогікі___________________________
Кіраўнік практыкі ад кафедры псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці________________________________________________________
Дырэктар установы адукацыі ________________________________
Намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай працы __________________

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры ____________________________
Класны кіраўнік ________________________________________________
Адрас установы адукацыі___________________________________________
Тэлефон_________________________________________________________

3. Расклад урокаў у ___ класе:

4. Расклад званкоў:

5. Спіс вучняў ____ класа

6. Каляндарна-тэматычны план вывучэння беларускай мовы ў __ класе з ______________ па _____________

| № | Праграмная тэма | Колькасць гадзін | Час вывучэння |
|---|---|---|---|
| | | | |

У каляндарна-тэматычным плане неабходна пазначыць заліковыя ўрокі.

7. Індывідуальны план вучэбна-выхаваўчай працы

| Дата | Падрыхтоўка і правядзенне ўрокаў. Метадычная і навукова-даследчая праца | Наведванне ўрокаў і ўдзел у іх аналізе | Падрыхтоўка і выкананне заданняў па педагогіцы і псіхалогіі |
|---|---|---|---|
| | | | |

8. Наведаныя ўрокі і іх аналіз.

9. Планы-канспекты пробных і заліковых урокаў.

10. Справаздача аб ходзе і выніках педагагічнай практыкі.

*Дадатак 2*

## НАВЕДВАННЕ І АНАЛІЗ УРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

За час вытворчай педагагічнай практыкі студэнтам неабходна наведаць і прааналізаваць значную колькасць урокаў беларускай мовы і літаратуры.

Асноўная мэта наведванняў – мэтанакіраванае назіранне за дзейнасцю настаўніка-славесніка (ці студэнта-практыканта) і працай вучняў, асэнсаванне станоўчага педагагічнага вопыту.

У працэсе аналізу ўрока звяртаецца ўвага на:

– правільнае вызначэнне мэтаў урока;

– апраўданы выбар тыпу ўрока, адпаведнасць структуры ўрока яго тыпу;

– выкарыстанне метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэтаў урока, зместу праграмнага матэрыялу, узроўню пазнавальных магчымасцей вучняў і інш.;

– узаемадзеянне настаўніка і вучняў на ўроку і інш.

У працэсе назіранняў студэнты ажыццяўляюць запісы па наступнай схеме:

1. Дата назірання, установа адукацыі, клас, месца ўрока ў раскладзе вучэбнага дня; прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка (студэнта-практыканта), які праводзіў урок; колькасць вучняў на ўроку.

2. Тэма ўрока. Месца ўрока ў агульнай сістэме ўрокаў па тэме. (Высвятляецца папярэдне.)

3. Мэты ўрока. (Высвятляюцца перад пачаткам урока.)

4. Падрыхтаванасць да ўрока настаўніка, вучняў, кабінета (наяўнасць у настаўніка плана-канспекта ўрока, стан працоўных месцаў вучняў, афармленне класнай дошкі і інш.)

5. Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем:

| **Ход урока** | **Аналітычны каментарый** |
|---|---|
| | |

Абмеркаванне ўрока адбываецца адразу ж пасля яго правядзення.

*Дадатак 3*

## ПРЫКЛАДНАЯ СХЕМА АНАЛІЗУ ЎРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

1. Падрыхтаванасць да ўрока настаўніка, вучняў, кабінета (наяўнасць у настаўніка плана-канспекта ўрока; падрыхтаванасць вучняў да ўрока, стан іх рабочых месцаў; афармленне дошкі, абсталяванне ўрока, санітарны стан кабінета.)

2. Тэма ўрока. Адпаведнасць тэмы вучэбнай праграме. Месца ўрока ў агульнай сістэме ўрокаў беларускай мовы.

3. Мэты ўрока, правільнасць іх вызначэння і фармулёўкі.

4. Тып ўрока, яго структура. Адпаведнасць структуры ўрока яго тыпу.

5. Праверка дамашняга задання: формы, спосабы, метады і прыёмы.

6. Тлумачэнне новага матэрыялу: навуковасць, сістэмнасць, адпаведнасць выкладу ўзроставым асаблівасцям вучняў, правільнасць выбару метадаў тлумачэння.

7. Сувязь новага матэрыялу з раней вывучаным, пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні.

8. Віды практыкаванняў і заданняў, іх метадычная вартасць, роля ў фарміраванні неабходных уменняў і навыкаў. Якасць дыдактычнага матэрыялу (насычанасць моўнымі з’явамі, развіццёвая і выхаваўчая накіраванасць і інш.)

9. Рэалізацыя на ўроку задач развіцця вуснага і пісьмовага маўлення вучняў.

10. Выкарыстанне сродкаў навучання (падручніка, слоўнікаў, раздатачнага матэрыялу і інш.), іх роля ў ажыццяўленні мэтаў урока.

11. Мэтазгоднасць і эфектыўнасць выкарыстання наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў навучання.

12. Формы, спосабы і якасць праверкі і ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў школьнікаў.

13. Характар дамашняга задання: складанасць, аб’ём, адпаведнасць тэме ўрока, дыферэнцыраванасць, інструктаж па выкананні.

14. Адпаведнасць зместу ўрока яго тэме і мэце.

15. Выкананне плана ўрока. Ці былі адступленні ад намечанага плана? Чым гэта выклікана? Ці апраўдана метадычна?

